ПАДЗЕЯ

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА Ў РОДНЫМ СЛОВЕ

**8 мая 2024 года традыцыйнай грамадска-літаратурнай акцыяй «Пад мірным небам Беларусі» Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі адзначыла свята Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Сёлета напярэдадні свята пісьменніцкі дэсант наведаў нашых верных сяброў з аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна горада Гродна». Калектывам аддзялення кіруе вельмі цікавы, творчы чалавек Ігар Анатольевіч Карнюшка. Менавіта дзякуючы яму жыццё пастаяльцаў цэнтра напоўнена яркімі, запамінальнымі падзеямі, сустрэчамі з цікавымі людзьмі, якім тут заўсёды шчыра рады. Але і сам калектыў пастаянна на «культурнай перадавой» – на канцэртах і экскурсіях, часты госць на літаратурных мерапрыемствах з удзелам СПБ. Майскую сустрэчу ў межах святочнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі» можна назваць візітам у адказ, працягам сяброўства.



У склад удзельнікаў акцыі «Пад мірным небам Беларусі-2024» увайшлі гродзенскія літаратары: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; дзіця вайны, беларускі паэт Браніслаў Ермашкевіч; паэт, блогер Анатоль Апанасевіч; паэтэса Кацярына Каламійцава і паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Традыцыйная акцыя СПБ-Гродна, якая, нагадаем, стартавала ў 2015 годзе, прайшла ў фармаце ўтульнай літаратурнай гасцёўні. Акрамя літаратурна-мастацкіх твораў ваенна-патрыятычнага зместу, у праграме акцыі прагучалі і песні на тэмы Вялікай Айчыннай вайны і Перамогі, папулярныя і аўтарскія. Аўтар і выканаўца песень – Ігар Карнюшка (вакал, клавішныя). Кожным з прысутных на мерапрыемстве адчувалася асаблівая важнасць моманту. Кожнае слова з вуснаў гасцей трапяткім хваляваннем адклікалася ў сэрцах слухачоў. Пісьменнікі гаварылі пра радасць свяшчэннага пераможнага дня – 9 мая 1945 года, пра тое, чаму гэтая радасць – са слязамі на вачах. Гаварылі госці і пра тое, якія незагойныя раны нанесла вайна іх сем'ям і іх блізкім, якія пакінула балючыя ўспаміны. Высветлілася, што гэта тэматыка блізкая ўсім. Людміла Антонаўна прачытала зусім новыя вершы пра ветэранаў, якіх

становіцца ўсё менш, і пра свайго бацьку-франтавіка. Таксама наш літаратурны лідар праанансавала выданне літаратурнага зборніка ваенна-патрыятычнага зместу «Памяці вечны агонь». Браніслаў Ермашкевіч прысвяціў радкі сваіх твораў ахвярам вайны і радасці здабыцця міру, трагедыі сваёй сям'і (бацька паэта пайшоў на вайну і прапаў без вестак), а таксама вобразам спаленых вёсак. Маці трох сыноў, паэтэса Кацярына Каламійцава прысвяціла пранікнёныя радкі сваёй лірыкі тэмам гістарычнай памяці і пераемнасці пакаленняў. Анатоль Апанасевіч падзяліўся сямейнымі ўспамінамі аб вайне, якія захоўваюцца і перадаюцца яго роднымі, як эстафета памяці і радасці перамогі. Акрамя ўласных радкоў лірыкі, Анатоль Уладзіміравіч прадэкламаваў ваенна-патрыятычныя творы некаторых гродзенскіх паэтаў. Дзмітрый Радзівончык прачытаў нарыс пра свайго дзеда-франтавіка; твор прынёс аўтару перамогу ў беларуска-расійскім Сіманаўскім літаратурным конкурсе (намінацыя «Публіцыстыка»).

Аўдыторыя ўспрымала гучанне твораў сучаснай айчыннай літаратуры вельмі пачуццёва, са шчырай зацікаўленасцю і адорвала іх аўтараў гучнымі апладысментамі. У фінале акцыі адбыліся таксама традыцыйныя фотасесія і аўтограф-сесія. На Дзень Перамогі ў знак непахіснага сяброўства аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў атрымала ад гродзенскіх пісьменнікаў падарункі – кнігі з аўтографамі. Асноўным матывам мерапрыемства стала неабходнасць захавання еднасці і мірнага неба над нашай Радзімай. Роднае мастацкае слова натхніла, напоўніла кранальнай цеплынёй сэрцы людзей, дзе будзе гучаць голасам вечнай памяці, прагі жыцця і міру.

Традыцыйная грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» працягваецца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** эпізоды і ўдзельнікі літаратурнай гасцёўні ў межах традыцыйнай акцыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі». Аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна горада Гродна». 8 мая 2024 года.



**Выступае кіраўнік дэлегацыі Л. А. Кебіч**







**Выступае дзіця вайны, беларускі паэт Браніслаў Ермашкевіч**







Слова Анатолю Апанасевічу



Выступае маці трох сыноў, паэтэса Кацярына Каламійцава







Дзмітрый Радзівончык прачытаў нарыс пра свайго дзеда-франтавіка




**Ідзе аўтограф-сесія**




**Л. А. Кебіч і І. А. Карнюшка**


Нет Никого
Кроме Него
поэзия





